№ 03 (596), студзень 2016 года

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый. Кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства

*Запрашаюць атрымаць вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны»*

Падрыхтоўка кадраў па гэтай спецыяльнасці адбываецца ўжо 20 гадоў і ахоплівае асноўныя кірункі развіцця музеяў свету і Беларусі, а таксама найважныя праблемы, звязаныя з аховай помнікаў гісторыі, культуры, уключэннем музеяў у турыстычную дзейнасць. Нашыя выпускнікі запатрабаваныя незвычайна: працуюць дырэктарамі абласных і раённых музеяў у Віцебску, Вілейцы, Лагойску і іншых гарадах, галоўнымі захавальнікамі музейных фондаў, старшымі навуковымі супрацоўнікамі ў музеях.

***Спецыяльнасць* «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны»** патрабуе глыбокіх і разнастайных ведаў, таму студэнты вывучаюць гісторыю Беларусі, сусветную гісторыю, гісторыю і тэорыю культуры, гісторыю краязнаўства, такія спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны, як нумізматыка, сфрагістыка, адну з замежных моваў (англійская, французская, нямецкая і іспанская), а таксама лацінскую і польскую. З трэцяга курса пачынаецца самае цеснае знаёмства са спецыяльнасцю, таму студэнты вывучаюць гісторыю музейнай справы, навукова-фондавую дзейнасць музея, тэорыю і практыку экскурсійнай працы, інфармацыйныя тэхналогіі ў музеях, гісторыю і арганізацыю турызму, іншыя дысцыпліны, звязаныя з турыстычным накірункам.

**Праца ў музеі і турыстычнай сферы** – гэта праца з наведнікамі, таму нашым студэнтам выкладаюцца сцэнарна-рэжысёрскія асновы музейнай і турыстычнай дзейнасці. Тэарэтычныя веды замацоўваюцца пад час практыкі ў сталічных музеях і турыстычных фірмах.

Студэнты маюць магчымасць удзельнічаць у навуковых канферэнцыях, пасля заканчэння навучання паступіць у магістратуру, затым аспірантуру, абараніць кандыдацкую дысертацыю ў савеце ўніверсітэта.

Спецыфіка нашага ўніверсітэта дазваляе студэнтам удзельнічаць у самых разнастайных культурных мерапрыемствах. Для іх арганізуюцца экскурсіі па рэгіянальных музеях і памятных мясцінах Беларусі, сустрэчы з цікавымі людзьмі.

Універсітэт мае два добраўпарадкаваных сучасных інтэрнаты.

Калі ў вас узнікла жаданне атрымаць адукацыю ў галіне музейнай справы і турызму, то трэба падрыхтавацца і здаць тэсты: *беларуская (ці руская) мова; гісторыя Беларусі; усеагульная гісторыя (найноўшы час).*

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў запрашае абітурыентаў для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання па гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі (найноўшая гісторыя). Высокакваліфікаваныя выкладчыкі з навуковымі ступенямі і званнямі дапамогуць вам авалодаць неабходнымі ведамі для паспяховай здачы цэнтралізаванага тэсціравання.

***Тэлефоны для даведак:*** +375 (017) 209 49 97 (кафедра); +375 (017) 222 83 06 (прыёмная камісія).

Парадак і правілы прыёму, даты правядзення дзён адкрытых дзвярэй і іншая інфармацыя на сайце ўніверсітэта: www.buk.by.

***Сардэчна запрашаем у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў на спецыяльнасць «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны»!***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ